# БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА І ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ: ПРАБЛЕМЫ АДАПТАЦЫІ І ЗАХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДМЕТНАСЦІ

***Р. Б. Смольскі,***
*галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў,*
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар*

Сённяшняе грамадства прызвычаілася да паняцця глабалізацыі і ўспрымае яе як натуральную з'яву сучаснай цывілізацыі з відавочнымі станоўчымі здабыткамі ў многіх галінах матэрыяльнай вытворчасці, новых тэхналогій і, адначасова, праблемамі негатыўнага кшталту – барацьбой за прыродныя рэсурсы, рэлігійнымі канфліктамі, прыніжэннем спрадвечных гуманістычных каштоўнасцей і ідэалаў. Адным словам, глабалізацыя рашуча ўвайшла літаральна ва ўсе «шчыліны» грамадскага і прыватнага існавання чалавека і ўсёй людской супольнасці.

Таму, на наш погляд, *адметнасці глабалізаванай цывілізацыі* (зразумела, што гэтымі якасцямі не абмяжоўваецца разнастайная і супярэчлівая сутнасць глабалізацыі) патрабуюць самай пільнай увагі навуковай і творчай грамадскасці, сістэмнага вывучэння, назапашвання адпаведных ведаў, якія, упэўнены, не зашкодзяць у пошуку вызначэння шляхоў і сродкаў далейшага развіцця народаў свету і іх нацыянальных культур у новай рэчаіснасці.

Рэспубліка Беларусь і наша нацыянальная культура і мастацтва – не выключэнне ў гэтай сітуацыі, а наадварот, з улікам вядомых асаблівасцей гістарычнага станаўлення беларускага этнасу і беларускай дзяржаўнасці, патрабуюцца значныя інтэлектуальныя і творчыя намаганні ў сістэмным і глыбокім вывучэнні разнастайных працэсаў глабалізацыі дзеля выпрацоўкі канкрэтных і эфектыўных захадаў у мэтах далейшага паспяховага дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва.

Глабалізацыя – з'ява ў сучасных працэсах развіцця сусветнай цывілізацыі зусім «маладая». Толькі ў 1983 г. тэрмін «глабалізацыя» быў упершыню ўведзены ў навуковы абыходак прафесарам Гарвардскай школы бізнесу Theodore Levitt. Пры гэтым амерыканскі вучоны ўкладваў у свой тэрмін толькі і выключна *эканамічнае значэнне* і нічога больш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А ўжо ў канцы XX ст. гэты тэрмін сталі зусім небеспадстаўна прымяняць практычна да ўсіх сфер жыцця: эканамічнага, палітычнага, культурнага, ваеннага і г.д. Аднак дакладнага вызначэння гэтага тэрміна да сённяшняга часу няма, хаця пра глабалізацыю спрачаюцца, разважаюць вучоныя, палітыкі, ваенныя, грамадскія і рэлігійныя дзеячы, майстры мастацтва, адным словам, усе, хто неабыякавы да лёсу не толькі сваёй краіны, сваёй нацыянальнай культуры, але і ўсяго сучаснага свету. Звычайна пад *глабалізацыяй* маюць на ўвазе як усеагульныя праблемы, якія закранаюць свет у цэлым, так і наступствы інтэграцыйных працэсаў – станаўлення адзінага сусветнага рынку, свабоднага руху рабочай сілы, тавараў і капіталу, распаўсюджвання інфармацыі. Сцвярджаюць таксама аб *інфармацыйнай рэвалюцыі* і нават, у паленіка-футуралагічным запале, аб нараджэнні ўжо ў прасторы XXI ст. *якасна новага чалавека* і глабальнай формы – *мегаграмадства, мегакультуры, суперэтнасу*. Напрыклад, дасведчаныя аўтары расійскай акадэмічнай 4-томнай «Новай філасофскай энцыклапедыі» прыходзяць да такога цікавага, хаця і небясспрэчнага, вываду: «В понятии “цивилизация” отражена мощная интегративная способность и сила, тенденция универсализма, позволяющая создавать некое сверхъединство, крупномасштабную общность на базе определенной социокультурной парадигмы» [2, с. 333 ].

Думаецца, што магутны рух глабалізацыі, нястрымнае распаўсюджванне Інтэрнэту, іншых новых сродкаў інфармацыі і камунікацыі могуць садзейнічаць праяўленню лепшых або горшых, узвышаных або ганебных уласцівасцей *прыроды чалавека*. Але яны, як зусім слушна і аргументавана лічаць многія аўтарытэтныя вучоныя, не могуць стварыць новага чалавека, гэта значыць, чалавека па-за вызначаным этнасам і вядучай цывілізацыі, а таксама буйных этнасаў, гісторыя і культура каторых вядзе адлік на многія стагоддзі і нават тысячагоддзі.

Таму спадзяванні некаторых радыкальных інтэлектуалаў на непазбежную інтэграцыю культур, на стварэнне адзінай сусветнай культуры і нават «зліццё» ў будучым нацый і народаў у нейкі планетарны «суперэтнас» або «мегаграмадства» прадстаўляюцца вельмі і вельмі нерэальнымі. Да гэтага варта дабавіць яшчэ адзін надзвычай важны і прынцыповы фактар: *супярэчлівы характар глабалізацыі*. Ён заключаецца ў тым, што, дапамагаючы актыўнай камунікацыі паміж народамі і павялічваючы агульныя элементы (у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўным інфармацыйнага і тэхналагічнага парадку), глабалізацыя нараджае адначасова мноства самых розных вострых канфліктаў – эканамічных, палітычных, ідэалагічных, нацыянальных, ваенных і шмат іншых.

Такім чынам, пры ўсім адзінстве чалавечага роду, агульнакультурных каштоўнасцей і арыентацый захоўваюцца тым не менш *фундаментальныя перадумовы для захавання нацыянальнай своеасаблівасці, ідэнтычнасці этнічных культур і многіх відаў мастацтва*. Гэта, калі максімальна сцісла і тэзісна, сутнасны, так бы мовіць, філасофскі аспект, звязаны з тэрмінам «*глабалізацыя*».

Але ёсць і другі вельмі важны аспект у вызначэнні гэтага тэрміна, які мы павінны ўлічваць. Яго максімальна ясна і без усялякіх дыпламатычных «хітрыкаў» выказаў былы дзяржсакратар ЗША Г. Кісінджар у сваёй лекцыі, якую ён прачытаў 12 кастрычніка 1999 г. у адным з каледжаў Дубліна (Ірландыя). «Галоўны выклік складаецца з таго, – сказаў Г. Кісінджар, – што тое, што мы называем глабалізацыяй, на самай справе проста іншая назва пануючай ролі Злучаных Штатаў» [1]. Думаецца, аспрэчваць гэты вывад шматвопытнага амерыканскага палітыка не выпадае: развіццё сусветнай гісторыі пасля распаду СССР у значнай ступені вызначаецца менавіта палітыкай ЗША.

Калі браць адлік навейшай гісторыі сучаснага беларускага мастацтва з мяжы XX і XXI ст., то відавочна: *айчыннае мастацтва адчувае ўсё больш узрастаючы ціск самых разнастайных праяў безупыннага працэсу пашырэння глабалізацыі ў сферы культурнага і духоўнага жыцця грамадства, дзяржавы, асобнага індывідуума*. І як любы буйны, складаны і супярэчлівы працэс глабалізацыйныя праяўленні неадназначныя. З аднаго боку, глабалізацыя ў культурнай сферы прыносіць шмат новага і пазітыўнага, актыўна спрыяе творчаму развіццю, абнаўленню нацыянальных культур праз відавочнае пашырэнне разнастайных міжнародных кантактаў і ўкараненне сучасных тэхналогій у мастацкі працэс; з іншага – глабалізацыя нясе небяспеку стагнацыі, упадку, асіміляцыі нацыянальнай культуры пад моцным уздзеяннем агрэсіўнай масавай заходняй культуры, і асабліва *экраннай культуры заходняга свету*: кінематографа, тэлебачання, Інтэрнэту і г.д.

Сучаснае грамадства ўсё ў большай ступені з’яўляецца залежным ад магутных і ўсёабдымных інфармацыйных патокаў, навейшых сродкаў, прыёмаў і методык уздзеяння на фарміраванне светапогляду, у першую чаргу моладзі. Літаральна на вачах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

удасканальваецца разнастайны інструментарый псіхалагічных і інфармацыйна-прапагандысцкіх акцый, кампаній, аперацый і інш. Бурнае развіццё сучасных інфармацыйных патокаў аказвае глыбокае і нярэдка рашаючае ўздзеянне на стан і дынаміку культурных працэсаў. Больш таго, на вялікі жаль, ранейшыя культурныя дасягненні грамадства і індывідуума пачынаюць пастунова губляць сваё сутнаснае значэнне і каштоўнасць. Нават базавая сістэма адукацыі, прынятая ў грамадстве, перастае эфектыўна выконваць сваю ранейшую вельмі важную станоўчую ролю. Для многіх маладых людзей сёння значна большае значэнне мае не сума атрыманых ведаў, а тое, што яны пачуюць па радыё, убачаць на экране кінатэатра, прачытаюць у інтэрнэце.

Гэта – адна з прыкметных і даволі небяспечных праяў сённяшняй складанай і стракатай мноствам разнастайных колераў і адценняў рэальнасці. Вось чаму зараз надзвычай важна і неабходна з боку дзяржавы і грамадства сістэмна і мэтанакіравана прымаць навукова абгрунтаваныя захады для вырашэння галоўнай задачы – *арганізацыі паўнакроўнага, змястоўнага, нацыянальна адметнага культурнага жыцця.* Адсюль вынікае патрэбнасць актыўна і мэтанакіравана падтрымліваць лепшыя гуманістычныя традыцыі нацыянальнай мастацкай культуры, садзейнічаць больш хуткаму станаўленню перспектыўнай творчай моладзі, на плечы якой кладзецца адказнасць шукаць і знаходзіць пераканальныя адказы на жорсткія выклікі, што ўзніклі ў XXI ст. і будуць далей множыцца.

Якія сёння ідуць працэсы у беларускім мастацтве? Як яно існуе ў цяперашніх складаных умовах, калі адбываецца працэс фарміравання асноў рынкавых адносін у сферы мастацтва, з аднаго боку, і відавочна жорсткая экспансія заходняй масавай культуры з іншага.

Возьмем, да прыкладу, *тэатральнае мастацтва*, якое ў пэўнай ступені з'яўляецца своеасаблівым адбіткам стану ўсёй нацыянальнай культуры. У гэтай сувязі заўважым важную акалічнасць: *сучасны беларускі тэатр карыстаецца ўвагай і павагай грамадства і сур'ёзнай падтрымкай з боку дзяржавы*.

Гэтаму шмат прыкладаў. Так, за апошняе дзесяцігоддзе створаны два новыя дзяржаўныя тэатры: Драматычны тэатр Беларускай арміі (2002) і Палескі драматычны тэатр у Пінску (2006), а таксама шэраг прыватных прафесійных калектываў – Сучасны мастацкі тэатр У. Ушакова, Новы тэатр А. Марцірасяна, тэатр «Кампанія» (усе ў 2004 г.), «Тэатральны каўчэг» Я. Валабаева (2006) і інш. У гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд Міністэрствам культуры разам з творчымі саюзамі тэатральных дзеячаў і літаратурна-мастацкіх крытыкаў была распрацавана комплексная, навукова абгрунтаваная Праграма прыярытэтных кірункаў развіцця тэатральнай справы ў Рэспубліцы Беларусь на 2001– 2010 гады. Выкананне асобных пазіцый гэтай праграмы паспрыяла далейшаму ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы многіх тэатраў, развіццю творчага патэнцыялу, выхаванню акцёрскіх і рэжысёрскіх кадраў.

Былі прыняты і іншыя эфектыўныя захады для стымулявання творчай дзейнасці тэатральных работнікаў – указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб аплаце працы вядучых творчых работнікаў тэатральна-відовішчных арганізацый» (ад 6 чэрвеня 2001 г. № 306), «Аб дадатковых мерах па падтрымцы творчых работнікаў» (ад 11 чэрвеня 2001 г. № 308). У тэатраў з'явілася магчымасць атрымліваць дадаткова спонсарскую падтрымку: Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2011 г. № 77 дазваляе накіроўваць спонсарскія сродкі на развіццё мастацтва, правядзенне фестываляў, конкурсаў, аглядаў і іншых мерапрыемстваў.

Яшчэ адна важная падзея – утварэнне Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2010 г. конкурсу «Нацыянальная тэатральная прэмія». Правядзенне гэтага своеасаблівага творчага спаборніцтва ў 2011 і 2012 гг. выявіла шмат як станоўчых, так і негатыўных з'яў і праблем у сучасным беларускім сцэнічным мастацтве. Напрыклад, абнадзейвае плённая тэндэнцыя ўсё больш актыўнага звароту тэатраў да класічнай нацыянальнай спадчыны і сучаснай новай беларускай драматургіі. Некаторыя спектаклі паводле В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Аляхновіча, К. Крапівы, У. Караткевіча, А. Макаёнка, А. Адамовіча, а таксама сённяшніх драматургаў у рэжысёрскай інтэрпрэтацыі М. Пінігіна, В. Анісенкі, В. Баркоўскага, С. Кавальчыка, У. Савіцкага, Б. Луцэнкі, А. Гарцуева, К. Аверкавай і іншых таленавітых пастаноўшчыкаў узбагацілі мастацкую палітру беларускага тэатра новымі фарбамі сцэнічнай выразнасці, крэатыўнымі стасункамі з сённяшнім гледачом.

Гэта, натуральна, выклікае пэўны аптымізм і рэальную надзею не проста, як мы звычайна гаворым, на далейшае творчае развіццё, а на значнае якаснае абнаўленне сучаснай беларускай тэатральнай культуры, захаванне яе нацыянальнай адметнасці ва ўмовах жорсткага глабалізаванага «прэсінгу» маскультуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але адначасова трэба прызнаць і іншае, таксама відавочнае: наспелая творчая задача глыбокага мастацкага асэнсавання рэалій сённяшняга жыцця беларусаў у кантэксце сучаснай глабалізаванай цывілізацыі з яе вострымі праблемамі і супярэчнасцямі для цяперашніх лідараў айчыннай драматургіі і рэжысуры застаецца пакуль што неадольнай.

Тэатр, як вядома, складаны сінтэтычны і ў пэўнай ступені элітарны від мастацтва. Яшчэ адна ўласцівасць тэатра – яго калектыўная творчасць. У гэту своеасаблівую «калектывізацыю» драматычнага мастацтва мінулае XX ст. унесла адчувальныя карэктывы і рашуча вылучыла на адказную ролю безумоўнага лідара тэатральнай творчасці – постаць рэжысёра. Яшчэ ў 1926 г. вялікі рэфарматар тэатра К. С. Станіслаўскі заўважыў выключную ролю рэжысёра і выказаў думку, што «ў наша жыццё ўвайшла неад'емнай часткай палітыка, а гэта значыць, што ўвайшла думка аб дзяржаўным упарадкаванні, аб задачах грамадства ў наш час, значыць, і нам, рэжысёрам, цяпер трэба многа думаць аб сваёй прафесіі і развіваць у сабе асаблівае рэжысёрскае мысленне» [3, с. 252].

Таленавіты сучасны рэжысёр – гэта мастак, здольны ствараць арыгінальныя сцэнічныя творы, у якіх у суладдзі з ідэямі драматурга выразна гучаць і ўласныя думкі аб жыцці і чалавеку, трывогі, боль і надзеі, свае адносіны, свой позірк на актуальныя праблемы рэчаіснасці. Адным словам, рэжысёр разам з драматургам стаў сапраўдным аўтарам ідэйна-мастацкай канцэпцыі спектакля. Вось чаму менавіта да рэжысуры заўсёды павышаная ўвага дзеячаў мастацтва, гледачоў, крытыкі, грамадскасці, навукоўцаў.

Шматлікія праблемы сённяшняга тэатральнага працэсу абумоўлены не толькі аб'ектыўнымі эканамічнымі, сацыяльнымі, палітычнымі і іншымі законамі развіцця сучаснага этапу айчыннай гісторыі, але і ўласна творчымі. Многія відавочныя недарэчнасці і складанасці ў развіцці сучаснага сцэнічнага мастацтва закладзены ў невыразнасці самога падыходу да агульнай арганізацыі тэатральнай справы як неад'емнай, важнай і стваральнай часткі ўсёй нацыянальнай беларускай культуры.

Таму, мяркуем, сёння наспела неабходнасць распрацаваць і прыняць асобны *Закон аб тэатральнай дзейнасці ў Беларусі* (такі закон, напрыклад, ужо даўно ёсць і паспяхова працуе ва Украіне).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кадравы і навуковы патэнцыял для грунтоўнай распрацоўкі гэтага вельмі патрэбнага для культурнага жыцця краіны закона ў нас ёсць.

З іншых неабходных захадаў найперш назавём правядзенне мадэрнізацыі і аптымізацыі пэўных структур у дзяржаўных органах кіравання. У прыватнасці, варта стварыць асобны *Дэпартамент па справах тэатральнага мастацтва* з адпаведнымі паўнамоцтвамі, мэтамі і задачамі. Сістэмная дзейнасць такога дэпартамента дазволіць сканцэнтраваць і скіраваць усе фінансавыя, кадравыя і арганізацыйныя намаганні дзяржавы і грамадства на паспяховае развіццё тэатральнай галіны (будзем памятаць, што ў нас больш за 30 дзяржаўных і прыватных прафесійных тэатраў і іх колькасць па аб'ектыўных прычынах будзе з цягам часу павялічвацца!), на ўмацаванне і пашырэнне яе ролі ў нацыянальным культурным і духоўным жыцці.

Вядома, кожны від мастацтва патрабуе асобных падыходаў у вызначэнні і вырашэнні разнастайных і канкрэтных творчых, арганізацыйных, эканамічных і іншых пытанняў і праблем. Напрыклад, трэба і надалей удасканальваць і развіваць фестывальны рух, які дазваляе пашыраць і паглыбляць міжнародныя культурныя сувязі.

Лічу, наспела рашэнне аб пераўтварэнні існуючай «Гасцёўні Галубка» ў дзяржаўна-грамадскі *Нацыянальны цэнтр сцэнічнага мастацтва імя Уладзіслава Галубка*. Нагадаю, такія цэнтры нацыянальных сцэнічных культур ёсць у некаторых еўрапейскіх дзяржавах і яны робяць вялікую справу не толькі ў мэтах захавання творчых традыцый, але і іх развіцця, узбагачэння і, што таксама вельмі важна, актыўнага стварэння і распаўсюджвання пазітыўнага іміджу сваіх краін.

Разважаючы аб беларускім мастацтве ў прасторы XXI ст., нельга не адзначыць адну, на наш погляд, вельмі важную акалічнасць: у рэаліях нашага часу значна ўскладніліся ўмовы існавання прафесійнага мастацтва. З аднаго боку, мастацтва заклікана памагаць чалавеку не толькі «прыгожа адпачываць», але і садзейнічаць яму ў імкненні быць чалавекам маральным, эстэтычна адукаваным, свядомым грамадзянінам і патрыётам сваёй радзімы. З другога – сённяшнім дзеячам мастацтва неабходна вучыцца працаваць ва ўмовах глабалізаванай рынкавай канкурэнцыі, з праблемамі якой, зразумела, дзяржава не пакідае тэатр сам-насам. Наадварот, дзяржаўная падтрымка с кожным годам павялічваецца: фінансавая, эканамічная, арганізацыйная, юрыдычная і г.д. Але яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не хапае! І ніколі, відаць, не будзе хапаць. Гэта трэба творцам разумець і ўспрымаць як аб'ектыўны фактар рэчаіснасці і настойліва, крэатыўна шукаць новыя падыходы, новыя рашэнні, якія адпавядаюць агульнасусветным рынкавым законам у сферы мастацкай творчасці.

Аналіз сучаснага мастацкага жыцця нашай краіны паказвае, што многія дзеячы беларускага мастацтва паступова адаптуюцца да новых рэалій XXI ст. Яскравым сведчаннем гэтай тэзы могуць быць новыя таленавітыя творы ў розных відах і жанрах мастацтва, а самае галоўнае – з'яўленне маладых адораных мастакоў, музыкантаў, акцёраў, рэжысёраў, дызайнераў, аналітыкаў творчай дзейнасці. Узбагачаецца нацыянальная мастацкая школа: навучанне будучых дзеячаў сцэнічнага мастацтва, кіно і тэлебачання, выяўленчага і музычнага мастацтва, дызайну вядзецца на сучасным узроўні ў творчых вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах нашай краіны.

Разам з тым адзначым сведчанні наяўнасці нявырашаных праблем самага рознага кшталту: творчых, арганізацыйных, эканамічных, у тым ліку і тых, што абумоўлены працэсамі глабалізацыі, экспансіі заходняй масавай культуры. Характэрнымі рысамі сучаснай культурнай экспансіі з'яўляюцца: фарміраванне за кошт аднабаковага патоку інфармацыі ад цэнтра да перыферыі ў «залежных» дзяржавах пэўнага ладу жыцця і каштоўнасных арыентацый; укараненне і распаўсюджванне заходняй культуры як самай універсальнай, якая адмаўляе значэнне іншых нацыянальных культур; імкненне шляхам культурнай экспансіі дасягнуць палітычных мэт.

Сёння, на жаль, адбываецца даволі распаўсюджаны і небяспечны для мастацкага жыцця нашай краіны працэс размывання нацыянальных культурных традыцый. Выразныя рысы гэтага можна назіраць сёння ў тэатральным мастацтве, дзе дамінуюць п'есы замежных аўтараў, у асноўным мадэрнісцкага характару. У кінатэатрах і на тэлевізійных каналах (зразумела, размова ідзе пра беларускія тэлеканалы) даўно і ўпэўнена гаспадарыць замежная прадукцыя, з іх большасць амерыканская. Не лепшая сітуацыя на эстрадзе: дамінуюць «спевакі» з ненарматыўнай лексікай; «гумарысты» высмейваюць нацыянальныя традыцыі; у літаратуры пераважаюць тэмы тэхналогіі насілля і забойства, бульварнае і напаўпарнаграфічнае чціва. Падобныя працэсы назіраюцца і ў выяўленчым мастацтве, арт-дызайне і г.д. У выніку мяняецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шкала каштоўнасцей: *духоўнае нацыянальнае* замяняецца *бездухоўным наднацыянальным*, і малады чалавек, і пакаленне ў цэлым ужо некалькі іншыя, у пэўнай ступені адарваныя ад нацыянальных культурных каранёў.

Культура – трывалы падмурак суверэннай дзяржавы, паказчык узроўню духоўнага жыцця народа, вынік яго інтэлектуальнага, маральнага і эстэтычнага развіцця. Сваё прызначэнне яна можа здзейсніць толькі на грунце захавання сваёй самабытнасці, маральных каштоўнасцей, традыцыйных для нашага народа і нацыянальнага менталітэту.

На заканчэнне хачу яшчэ раз нагадаць свой галоўны тэзіс: актыўнае і плённае развіццё самабытнасці беларускага прафесійнага мастацтва дазволіць вырашыць надзвычай актуальную задачу – сфарміраваць надзейную сістэму.

Сучаснае айчыннае мастацтва – неад'емная частка культурнага, духоўнага і эканамічнага патэнцыялу беларускага народа і беларускай дзяржавы. Абараняць, развіваць і ўзбагачаць гэты патэнцыял – найпершая і пачэсная задача дзяржаўных і грамадскіх устаноў, аб'яднанняў, творчых саюзаў, усіх дзеячаў беларускай культуры. У большасці ад яе рашэння залежыць фарміраванне надзейнай сістэмы культурнай бяспекі ва ўмовах сучасных глабалізацыйных працэсаў і экспансіі.

---

1. Вопросы философии. – 2003. – № 1. – С. 80.

2. Новая философская энциклопедия : в 4 т. / Ин-т философии РАН ; гл. ред. В. С. Степин. – М. : Мысль, 2001. – Т. 4. – 736 с.

3. *Станиславский, К. С.* Статьи. Речи. Беседы. Письма / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1953. – 781 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ